**АДАМОВІЧ** Галіна Яўгенаўна [21. 05. 1955, в. Вяззе Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл. – 2.08.2016, Мінск], літаратуразнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1983), Дацэнт (1999).

Пасля заканчэння СШ № г. Магілёва (1972) паступіла на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, які скончыла ў 1972 г. Вучылася ў аспірантуры (1977–1980). Працавала ў выдавецтве "Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя П. Броўкі" (1980–1986). З 1986 г. працуе ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя М. Горкага (з 1993 г. БДПУ імя М. Танка): старшы выкладчык кафедры рускай і зарубежнай літаратуры (1986–1990), з 1990 г. дацэнт кафедры беларускай літаратуры, з 2004 г. загадчык гэтай кафедры.

Г. Я. Адамовіч – аўтар звыш 100 навуковых прац па сусветнай і беларускай літаратуры па праблемах узаемасувязей. Найбольш значныя з іх: "Літаратура і культура: праблемы аналізу і сінтэзу" (1993), " З крыніц сусветнай літаратуры" (1998), "Літаратура – кантэкст – тэзаўрус" (2003). Падрыхтавала раздзелы калектыўнай манаграфіі "Беларуская савецкая літаратура за мяжой" (1988), кнігі "Великие писатели XX века" (2002).

Г. Я. Адамовіч даследуе таксама пытанні методыкі выкладання беларускай літаратуры ў сусветным кантэксце, часта выступае з артыкуламі ў часопісе "Роднае слова", з'яўлецца адным з аўтараў праграмы па беларускай літаратуры для V–XI класаў (паглыбленае вывучанне), падручніка "Беларуская літаратура: XI клас" (1999, 2001), дапаможніка для настаўнікаў "Беларуская літаратура ў 11 класе" (2001).